# БЕЛАРУСКАЯ АПЕРАЦЫЯ. КОДАВАЯ НАЗВА «БАГРАЦІЁН» (23 ЧЕРВЕНЯ – 29 ЖНІЎНЯ 1944)

**Беларуская аперацыя** (23 червеня – 29 жніўня 1944) (кодавая назва «Баграціён»), адна з найбуйнейшых стратэгічных наступальных аперацый Чырвонай Арміі. На пачатак аперацыі фронт на Беларусі праходзіў па лініі воз. Нешчарда, на У ад Полацка, Віцебска, Оршы, Магілёва, Жлобіна і далей па р. Прыпяць да Ковеля, утвараючы т. зв. «Беларускі выступ», павернуты сваёй вяршыняй на У, даўжынёй больш за 1100 км, праз які праходзілі бліжэйшыя шляхі да граніц Германіі.

На тэрыторыі Беларусі вораг стварыў глыбокаэшаланіраваную (250–270 км) абарону (умоўная назва «Фатэрланд»), якая апіралася на развітую сістэму палявых умацаванняў і прыродныя рубяжы (абарончыя палосы праходзілі пераважна па зах. берагах шматлікіх рэк з шырокімі забалочанымі поймамі). Яе ўтрымлівалі група армій «Цэнтр» (генерал-фельдмаршал Э. Буш, з 28 чэрвеня генерал-фельдмаршал В. Модэль) у складзе армій 3-й танкавай, 4-й, 9-й, 2-й палявых, частка сіл 16-й арміі з групы армій «Поўнач» і левафланговыя злучэнні 4-й танкавай арміі з групы армій «Паўночная Украіна» – усяго 63 дывізіі і 3 брыгады, 1,2 млн. чал., 9500 гармат і мінамётаў, 900 танкаў і штурмавых гармат. Наземныя войскі падтрымлівалі 6-ы і частка сіл 1-га і 4-га паветраных флотаў (1350 самалётаў). Для разгрому варожай групоўкі савецкае Вярхоўнае Галоўнакамандаванне вылучыла значна большыя сілы – 2,4 млн. чалавек, больш за 36 тыс. гармат і мінамётаў, 5200 танкаў і самаходных арт. установак, каля 5,3 тыс. самалётаў, якія ўваходзілі ў франты: **1-ы Прыбалтыйскі** (генерал арміі ***І. Х. Баграмян***) у складзе армій 4-й ударнай (генерал-лейтэнант П. Ф. Малышаў), 6-й гвардз. (генерал-лейтэнант І. М. Чысцякоў), 43-й (генерал-лейтэнант А. П. Белабародаў), 3-й паветранай (генерал-лейтэнант авіяцыі М. П. Папівін), 1-га танкавага корпуса (генерал-лейтэнант танк. войск В. В. Буткоў); **3-і Беларускі** (генерал-палкоўнік, з 26 чэрв. ген. арміі ***І. Д. Чарняхоўскі***) у складзе армій 39-й (генерал-лейтэнант І. І. Люднікаў), 4-й (генерал-лейтэнант М. І. Крылоў), 11-й гвардз. (генерал-лейтэнант К. М. Галіцкі), 31-й (генерал-лейтэнант В. В. Глаголеў), 5-й гвардз. танкавай (маршал бранятанк. войск П. А. Ротмістраў), 1-й паветр. (генерал-лейтэнант авіяцыі М. М. Громаў, з 02.07.1944 генерал-палкоўнік авіяцыі Ц. Ц. Хрукін), конна-механізаванай групы (генерал-лейтэнант М. С. Аслікоўскі), 1-га гвардзейскага танкавага корпуса (генерал-маёр танк. войск А. С. Бурдзейны); **2-гі Беларускі** (генерал-палкоўнік, з 28 ліп. ген. арміі ***Г. Ф. Захараў***) у складзе армій 33-й (генерал-лейтэнант В. Дз. Кручонкін, з 09.07.1944 генерал-лейтэнант С. І. Марозаў), 49-й (генерал-лейтэнант І. Ц. Грышын), 50-й (генерал-лейтэнант І. В. Болдзін), 4-й паветр. (генерал-палкоўнік К. А. Вяршынін); **1-ы Беларускі** (ген. арміі, з 29.06.1944 Маршал Савецкага Саюза ***К. К. Ракасоўскі***) у складзе армій 3-й (ген.- лейт. А. В. Гарбатаў), 48-й (генерал-лейтэнант П. Л. Раманенка), 65-й (генерал-лейтэнант П. І. Батаў), 28-й (генерал-лейтэнант А. А. Лучынскі), 61-й (генерал-лейтэнант П. А. Бялоў), 70-й (генерал-палкоўнік В. С. Папоў), 47-й (генерал-лейтэнант М. І. Гусеў), 8-й гвардз. (генерал-палкоўнік В. І. Чуйкоў), 69-й (генерал-лейтэнант У. Я. Калпакчы), 1-й польскай (генерал-лейтэнант З. М. Берлінг), 2-й танк. (генерал-лейтэнант танк. войск І. С. Багданаў, з 23.07.1944 генерал-маёр А. І. Радзіеўскі), 6-й паветр. (генерал-лейтэнант авіяцыі Ф. П. Палынін), 16-й паветр. (генерал-палкоўнік авіяцыі С. І. Рудэнка), конна-механізаванай групы (генерал-лейтэнант І. А. Плieў), танкавых карпусоў – 9-га (генерал-маёр танк. войск Б. С. Бахараў, з 17.07.1944 генерал-маёр танк. войск Н. І. Ваейкаў), 1-га гвардз. (генерал-маёр

танк. войск М. Ф. Паноў), 11-га (генерал-маёр танк. войск П. М. Рудкін, з 15.07.1944 генерал-маёр танк. войск І. І. Юшчук), кавалерыйскіх карпусоў – 2-га гвардз. (генерал-лейтэнант У. В. Крукаў), 7-га гвардзейскага (генерал-маёр М. П. Канстанцінаў), Дняпроўскай ваеннай флатыліі (капітан 1-га рангу В. В. Грыгор'еў). Да ўдзелу ў аперацыі прыцягваліся таксама авіяцыя далёкага дзеяння (маршал авіяцыі А. Я. Галаванаў) і авіяцыя проціпаветранай абароны. З войскамі цесна ўзаемадзейнічалі партызаны. Дзеянні франтоў каардынавалі Маршалы Савецкага Саюза **А. М. Васілеўскі** (1-га Прыбалтыйскага і 3-га Беларускага) і **Г. К. Жукаў** (2-га і 1-га Беларускіх). Задача аперацыі – разграміць групу армій «Цэнтр», вызваліць Беларусь, пачаць вызваленне Літвы і Польшчы.

У адпаведнасці з планам Беларускай аперацыі прадугледжваўся адначасовы прарыў абароны праціўніка на 6 участках з мэтай расчляніць яго войскі і разбіць іх па частках. Асаблівае значэнне надавалася разгрому найбольш моцных флангавых груповак нямецка-фашысцкіх войск у раёнах Віцебска і Бабруйска, што забяспечвала ўмовы для імклівага прасоўвання буйных сіл 3-га Беларускага і 1-га Беларускага франтоў і развіцця іх паспяховага наступлення па збежных напрамках на Мінск. Уцалелыя ад разгрому войскі праціўніка планавалася адкінуць на глыбіню 200–250 км у нязручны для абарончых дзеянняў раён пад Мінскам, адрэзаць шляхі адыходу, акружыць і ліквідаваць іх. У далейшым, нарошчваючы ўдары і пашыраючы фронт наступлення, савецкія войскі павінны былі выйсці да заходніх граніц СССР. Поспех савецкіх войск на Беларусі прадугледжвалася таксама выкарыстаць для пераходу ў наступленне 2-га і 3-га Прыбалтыйскіх франтоў.

Паводле характару баявых дзеянняў і выкананым задачам Беларуская аперацыя падзяляецца на 2 этапы. На 1-м этапе (з 23 чэрвеня да 4 ліпеня) былі праведзены аперацыі: **Віцебска-Аршанская**, Магілёўская, Бабруйская і **Полацкая**, у ходзе **Мінскай** аперацыі вызвалены Мінск і акружана мінская групоўка войск праціўніка.

Раніцай 23.06.1944 галоўныя сілы 1-га Прыбалтыйскага, 3-га і 2-га Беларускіх франтоў пасля магутнай артылерыйскай і авіяцыйнай падрыхтоўкі перайшлі ў наступленне на Віцебскім, Аршанскім і Магілёўскім напрамках. 24 чэрвеня пачалі наступаць войскі 1-га Беларускага фронту на Бабруйскім напрамку. За 6 дзён наступлення яны прарвалі абарону праціўніка на глыбіню 100–150 км. Войскі 1-га Прыбалтыйскага фронту ва ўзаемадзеянні з войскамі 3-га Беларускага фронту 25–28 чэрвеня акружылі і разбілі віцебскую групоўку гітлераўцаў у складзе 5 дывізій. 26 чэрвеня вызвалены Віцебск, 28 чэрвеня – Лепель. 26 чэрвеня войскі 3-га Беларускага фронту ліквідавалі магутны вузел абароны на У ад Оршы і 27 чэрвеня вызвалілі горад. Адначасова войскі 2-га Беларускага фронту на магілёўскім напрамку фарсіравалі Проню, Басю, Дняпро і 28 чэрвеня авалодалі Магілёвам. Войскі правага крыла 1-га Беларускага фронту нанеслі ўдары з раёна Рагачова і Жлобіна ў напрамку Бабруйск – Асіповічы і з раёна на Пд ад Парыч у напрамку Бабруйск – Слуцк, акружылі і ліквідавалі бабруйскую групоўку ворага ў складзе 6 дывізій, 29 чэрвеня вызвалілі Бабруйск. Зламаўшы абарону ворага паміж Зах. Дзвіной і Прыпяццю, савецкія войскі рушылі на З. 1-ы Прыбалтыйскі фронт наступаў на Полацк і Глыбокае, 3-і, 2-і і 1-ы Беларускія франты вялі наступленне па сустрэчных напрамках на Мінск. Войскі 3-га Беларускага фронту 29–30 чэрвеня фарсіравалі Бярэзіну, 1 ліпеня вызвалілі Барысаў, 2 ліпеня – Вілейку, Краснае, адрэзалі 3-ю танкавую армію праціўніка ад яго 4-й арміі, перарэзалі чыгунку Мінск – Вільнюс. Войскі 1-га Беларускага фронту 30 чэрвеня вызвалілі Слуцк, 2 ліпеня – Стоўбцы, Гарадзею, 4 ліпеня — Нясвіж, перарэзалі чыгунку Мінск – Баранавічы. 3 ліпеня на світанні ў Мінск увайшлі 2-і

гвардзейскі танкавы корпус з У і ПнУ, злучэнні 5-й гвардзейскай танкавай арміі і перадавыя атрады 11-й гвардзейскай і 31-й армій 3-га Беларускага фронту з Пн, у сярэдзіне дня – войскі 1-га Беларускага фронту з ПдУ. Да канца дня Мінск поўнасцю вызвалены. На У ад горада савецкія войскі акружылі 105-тысячную групоўку ворага са складу 4-й і 9-й нямецкіх армій. Войскі 1-га Прыбалтыйскага фронту ў ходзе *Полацкай аперацыі 1944* вызвалілі 4 ліпеня Полацк і разгарнулі наступленне на Шаўляй.

У выніку 1-га этапа Беларускай аперацыі варожая група армій «Цэнтр» пацярпела катастрафічнае паражэнне, галоўныя сілы яе былі разбіты. У цэнтры савецка-германскага фронту ўтварыўся 400-кіламетровы пралом, закрыць яго за кароткі час вораг не мог. Савецкія войскі атрымалі магчымасць імкліва наступаць на З. На 2-м этапе (з 5 ліпеня да 29 жніўня) былі ажыццёўлены наступальныя аперацыі: Вільнюская, Беластоцкая, Люблін-Брэсцкая, **Шаўляйская** і Каўнаская.

Войскі 2-га Беларускага і частка сіл 3-га Беларускага франтоў з удзелам партызан закончылі 11 ліпеня ліквідацыю акружанай мінскай групоўкі нямецка-фашысцкіх войск – т. зв. «*мінскага «катла*». Гітлераўцы страцілі ў «катле» больш за 70 тыс. забітымі і каля 35 тыс. палоннымі. 17 ліпеня 57600 палонных, узятых пераважна на Беларусі, былі праканваіраваны па вуліцах Масквы. У ходзе наступлення савецкіх войск былі вызвалены 4 ліпеня Смаргонь, 5 ліпеня Маладзечна, 9 ліпеня Ліда (*Вільнюская аперацыя 1944),* 8 ліпеня Навагрудак, 14 ліпеня Ваўкавыск, 16 і 24 ліпеня Гродна (*Беластоцкая аперацыя 1944).* Пераадольваючы ўпартае супраціўленне праціўніка, савецкія войскі 8 ліпеня вызвалілі Баранавічы, 10 ліпеня – Слонім, 14 ліпеня – Пінск. Вызваленнем 28 ліпеня Брэста (*Люблін-Брэсцкая аперацгяя 1944*) закончана выгнанне нямецка-фашысцкіх захопнікаў з тэрыторыі БССР. У выніку 2-га этапа Беларускай аперацыі у канцы жніўня савецкія войскі выйшлі да Рыгі, на граніцу з Усх. Прусіяй на Нараў і Віслу.

У Беларускай аперацыі вялікую дапамогу Чырвонай Арміі аказвалі партызаны і насельніцтва Беларусі. На пачатак лета 1944 на акупіраванай тэрыторыі БССР дзейнічалі 144 партызанскія брыгады і 80 асобных атрадаў. Іх удзел у аперацыі «Баграціён» быў прадугледжаны Стаўкай Вярхоўнага Галоўнакамандавання і ўзгоднены з дзеяннямі франтоў. Пры штабах франтоў створаны аператыўныя групы БШПР, каб каардынаваць дзеянні партызанскіх сіл з войскамі. За 3 дні да пачатку Беларускай аперацыі партызаны пачалі масавае разбурэнне чыгуначных камунікацый ворага метадам «рэйкавай вайны» і наносілі ўдары да поўнага вызвалення тэрыторыі БССР. Было падарвана 61 тыс. рэек, 8 чыгуначных мастоў. У выніку поўнасцю выведзены са строю найбольш важныя чыгуначныя лініі, вораг не змог выкарыстаць іх для падвозу рэзерваў, эвакуацыі тылоў і вывазу нарабаванай маёмасці. У канцы чэрвеня 1944 ЦК КП(б)Б і ўрад БССР накіравалі партызанам радыёграму з заклікам узмацніць удары па ворагу, які адступаў, і наблізіць час перамогі. Партызаны перарэзалі шляхі адступлення праціўніку, зрывалі яго арганізаваны адыход, знішчалі жывую сілу і тэхніку, разбівалі штабы і гарнізоны, захоплівалі масты, пераправы і ўтрымлівалі іх да падыходу савецкіх войск, самі і разам з войскамі вызвалялі гарады і вёскі, ратавалі насельніцтва ад знішчэння. Партызаны захапілі і пабудавалі новыя масты і пераправы цераз Друць, Ольсу, Пціч, Случ, Бярэзіну, Нёман і інш., да падыходу Чырвонай Арміі вызвалілі раённыя цэнтры Капыль, Старобін, Узду, Куранец, Астравец, Ілью, Відзы, Свір, Івянец, Карэлічы, Любчу, чыг. ст. Будслаў, Княгініна, Гудагай і інш., разам з часцямі Чырвонай Арміі – Чэрвень, Слуцк, Клічаў, Лунінец, Асцювічы, Баранавічы, Стоўбцы, Маладзечна, Вілейку, Лагойск, Пінск і інш., удзельнічалі ў ліквідацыі акружаных груповак. У баях з нямецкімі войскамі ў час іх адступлення беларускія партызаны знішчылі

больш за 15 тыс. і ўзялі ў палон больш за 17 тыс. гітлераўцаў. Удзельнікі камуністычнага падполля передавалі савецкаму камандаванню звесткі пра абарону праціўніка, паказвалі замініраваныя будынкі, удзельнічалі ў вулічных баях. З вялікім патрыятычным уздымам працоўныя Беларусі ўступалі ў Чырвоную Армію: з вызваленай тэрыторыі БССР прызвана 600 тыс. чал., у т. л. 180 тыс. партызан.

У выніку Беларускай аперацыі поўнасцю вызвалена Беларусь, большая частка Літвы, частка Латвіі, усх. раёны Польшчы; Чырвоная Армія падышла да граніц Германіі. У ходзе аперацыі савецкія войскі знішчылі цалкам 17 дывізій і 3 брыгады, 50 дывізій страцілі больш за палавіну свайго складу, разграмілі нямецкую групу армій «Цэнтр». Разгром нямецка-фашысцкіх захопнікаў на Беларусі меў вялікае значэнне для вызвалення Прыбалтыкі, Зах. Украіны, Польшчы, стварыліся ўмовы для далейшага наступлення савецкіх войск на тэрыторыю Германіі, для разгортвання наступальных аперацый англа-амерыканскіх войск, якія 06.06.1944 высадзіліся ў Нармандыі (Паўн. Францыя), адкрылі другі фронт. Радзіма высока ацаніла гераізм воінаў Чырвонай Арміі і народа ў баях за вызваленне Беларусі: больш як 1500 генералам, афіцэрам і салдатам прысвоена званне Героя Савецкага Саюза, у ліпені – жніўні 1944 ордэнамі і медалямі ўзнагагоджаны больш за 402 тыс. воінаў. Больш за 600 вайсковых часцей і злучэнняў атрымалі *ганаровыя найменні.*

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Баграмян, И. Х.** Операция «Багратион» / И. Х. Баграмян // Так мы шли к победе / И. Х. Баграмян. – М. : Воениздат, 1988. – С. 440–468.

2. **История** Великой Отечественной войны Советского Союза, 1941–1945 : в 6 т. / ред. комиссия: П. Н. Поспелов (пред.) [и др.]. – М. : Воениздат, 1962. – Т. 4 : Изгнание врага из пределов Советского Союза и начало освобождения народов Европы от фашистского ига (1944 год) / авт. коллектив: М. Л. Альтговзен [и др.]. – 740 с.

3. **Лемяшонак, У. І.** Беларуская аперацыя 1944 / У. І. Лемяшонак // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945 : энцыклапедыя / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн. : БелСЭ імя П. Броўкі, 1990. – С. 71–74.

4. **Операция** «Багратион». Освобождение Белоруссии / авт. коллектив: В. А. Жилин [и др.]. – М. : ОЛМА-ПРЕСС, 2004. – 488 с. – (Архив).

5. **Освобождение** Белоруссии, 1944 / под ред. А. М. Самсонова. – Изд. 2-е, испр. и доп. – М. : Наука, 1974. – 799 с. – (Вторая мировая война в исследованиях, воспоминаниях, документах).

6. **Разгром** фашистских войск в Белоруссии // Очерки истории Великой Отечественной войны, 1941–1945 / редкол.: Б. С. Тельпуховский (отв. ред.) [и др.]. – М. : Изд-во АН СССР, 1955. – С. 339–356.